**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2021 г.**

## Мерапрыемствы да дня пажылых людзей

**1 кастрычніка**

У Міжнародны дзень пажылых людзей бібліятэкары разам з дзіцячымі брыгадамі міласэрнасці, якія дзейнічаюць пры сельскіх бібліятэках сістэмы (12 брыгад), наведалі на даму людзей сталага ўзросту, уручылі віншавльныя паштоўкі, зробленыя сваімі рукамі. Дзеці з задавальненнем прачыталі дзядулям і бабулям чуллівыя вершы і паспявалі вясёлыя песні.

**1 кастрычніка**

На гадзіну карысных парад "Як жыць з задавальненнем, або старасць у радасць» сабраліся сталыя людзі разам са сваімі ўнукамі. Бібліятэкар пазнаёміла гасцей з парадамі знакамітых людзей, як падоўжыць маладосць і адсунуць старасць; звярнула ўвагу прысутных на тыя кнігі і перыядычныя выданні, дзе можна знайсці практычныя веды па ўмацаванні фізічнага здароўя, зрабіла кароткі агляд выставы "Кнігі майго юнацтва". Юныя чытачы бібліятэкі паказалі прысутным невялікі канцэрт.

Лукская ПБ, 23 чал.

**1 кастрычніка**

Члены аматарскага клуба "Тэрніца" запрасілі на рэтра-гадзіну "Ты не считай ни лет, ни зим" сваіх бабуль. Дзеці расказалі пра гісторыю з'яўлення Міжнароднага дня пажылых людзей. З гонарам члены клуба распавялі пра сваіх бабуль і дзядуляў: як каго клічуць, хто кім працаваў, пазнаёмілі з вырабамі сваіх бабуль, якія прынеслі на пасяджэнне. Прагучалі вершы А. Барто, В. Арлова, Т. Абрынскай і інш. У канцы сустрэчы ўсе паглядзелі відэяфільм "Мая бабуля лепей усіх".

Стрыгаўская ПБ, 18 чал.

## Мерапрыемствы да Дня маці

У бібліятэках установы прайшла акцыя "Бібліятэка – мамам". На працягу тыдня ўсе мамы, якія прыйшлі ў бібліятэкі сістэмы, мелі магчымасць скарыстацца сервіснымі паслугамі бібліятэк бясплатна. Прыемным сюрпрызам стала ўручэнне мамам малюнкаў іх дзяцей, якія былі намаляваны раней.

**14 кастрычніка**

"Чтобы счастье сияло из маминых глаз"... Пад такой прыгожай назвай было праведзена свята, прысвечанае Дню маці, якое арганізавалі

супрацоўнікі Тевельскай публічнай бібліятэкі і сельскага клуба. Мамы на свяце атрымалі прыемныя словы любові і павагі ад сваіх дзяцей і удзельнікаў літаратурна-паэтычнай групы "Вдохновение". Для прысутных прадстаўлена кніжная выстава "Абарані, анёл, маю матулю". Старшыня сельскага савета Кузняцова Інна Валер'еўна павіншавала усіх прысутных са святам і ўручыла падарункі шматдзетным маці.

Тэвельская ПБ, 48 чал.

**14 кастрычніка**

У рамках Тыдня маці прайшоў літаратурна – паэтычны час «Ты одна такая - любимая и родная!». Бібліятэкар расказала аб тым, кем з'яўляецца мама для кожнага чалавека. Член Міжнароднай Асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзея Момлік прачытала свае вершы пра маму. Да свята была аформлена кніжная выстава «Образ пленительный, образ прекрасный», якая не засталася без увагі. У концы мерапрыемства дзеці паглядзелі цікавыя відэаролікі з дзіцячага часопіса «Ералаш».

Дзівінскі філ., 24 чал.

**15 кастрычніка**

Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі запрасілі жанчын – членаў Беларускага таварыства па зроку на літаратурна-музычную кампазіцыю «Кто сердцем для других живет», прымеркаваную да Дня маці.

У час мерапрыемства гучалі вершы, прысвечаныя мамам. Вакальная група «Фантазия» цэнтральнай бібліятэкі прадставіла прысутным музычную віншавальную праграму. Старшыня Кобрынскага аддзялення Беларускага таварыства па зроку Смеховіч Валянціна Мікалаеўна ўручыла членам таварыства памятныя падарункі.

ЦРБ, 38 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 кастрычніка**

У рамках прафілактыкі суіцыядальных паводзін сярод моладзі для студэнтаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа и вучняў СШ №1 г. Кобрына прайшоў цыкл мерапрыемстваў «Ценность моей жизни», накіраваный на захаванне і ўмацаванне псіхічнага здароўя.

Свяшчэннаслужыцель айцец Андрэй са Свята-Хрыстараждественскай царквы правёў бяседу аб сэнсе чалавечага жыцця, аб адносінах царквы да самагубства. Урач-валеолаг цэнтра “ОРИЕНТИР» Вольга Філіпеня расказала аб прычынах самагубства і фактарах рыску, аб тым, куды звяртацца, калі папаў у цяжкую жыццёвую сітуацыю, адказала на пытанні.

Мерапрыемства суправаджалася паказам відэароліка «Взгляни на жизнь по-новому!».

ЦРБ, 49 чал.

**6 кастрычніка**

Гадзіна разважанняў «Трезвость как норма жизни» была прымеркавана да Сусветнага дня цвярозасці і барацьбы з алкагалізмам. Урач па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева і нарколаг Юлія Шорах расказалі юнакам аб уздзеянні алкагольных напояў на арганізм чалавека, прывялі статыстыку па алкагалізму ў Кобрыне і Кобрынскім раёне. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Личность и алкоголь».

ЦРБ, 32 чал.

**15 кастрычника**

У час справаздачна-выбарчай канферэнцыі Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі быў уручаны членскі білет і значок Саюза пісьменнікаў Беларусі кіраўніку паэтычнага клуба “ПоэтиКО” цэнтральнай бібліятэкі паэтэссе і выдаўцу Наталлі Кандрашук. Наталля Кандрашук стала паўнапраўным членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. *(Заря. – 2021. – 23 кастрычніка), (Навіны Камянеччыны. – 2021. – 23кастрычніка* - *№43 – с. 7)*

**24 кастрычніка**

На літаратурнае рандэву «На перекрёстках прозы и поэзии» члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо», які працуе працуе ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, сабраліся анлайн.

Паэты подзяліліся адзін з другім сваёй творчасцю і вывучылі адрозненне прозы ад паэзіі.

ЦРБ, 15 чал.

**25 кастрычніка**

Члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўніка літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталлю Кандрашук (Ефціфееву) і члена гэтага ж клуба Марыну Міхалюк запрасілі ў літаратурную гасцёўню ў СШ № 8 г. Кобрына.
Паэты падзяліліся сваёй творчасцю з вучнямі і настаўнікамі, расказалі пра асабісты шлях у літаратуру, прэзентавалі зборнікі вершаў. Сюрпрызам для прысутных сталі міні-конкурсы ад гасцей, пераможцы якіх атрымалі ў падарунак паэтычныя кнігі Наталлі Кандрашук і Марыны Міхалюк з аўтографамі аўтараў. Музычным упрыгожваннем сустрэчы сталі песні ў выкананні вучаніцы 9 “В” класа Сафіі Веліч. *(Кобрин-информ. - 2021.- №42 – 21 октября.)*

ЦРБ, 66 чал.

*Выканаўца Т. А.Галавейка*
*3 85 81*